УДК [94+91](476.4)«65»

***Агееў А. Р., Шаруха І. М.***

# СПРОБА ГІСТОРЫКА-ГЕАГРАФІЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ РЭЧЫШЧА ДНЯПРА Ў РАЁНЕ ГОРАДА ШКЛОВА

У артыкуле зроблена спроба правядзення гісторыка-геаграфічнай рэканструкцыі рэчышча Дняпра ў раёне г. Шклова з мэтай пацвярджэння / абвяржэння гіпотэзы аб некалі астраўным становішчы горада. У ходзе даследаванняў з выкарыстаннем палявога, картаграфічнага, літаратурнага метадаў, метаду мадэлявання атрыманы шэраг важкіх аргументаў і доказаў у падтрымку гіпотэзы. Прамежкавыя вынікі сведчаць: у старажытнасці і ў сярэднявечччы рэчышча р. Днепр праходзіла ўздоўж заходняй тэрасы. Для ўстанаўлення больш дакладных датыровак, карэкціроўкі некаторых аргументаў (напр., геалагічных, геамарфалагічныя) плануецца працяг палявых геолага-геаграфічных даследаванняў. На аснове даследавания мяркуецца распрацоўка методыкі аптымізацыі археалагічных пошукаў старажытных гарадзішчаў, паселішчаў прырэчышчавай тыпу.

*Ключавыя словы:* Днепр, Шклоў, гісторыка-геаграфічная рэканструкцыя.

В статье предпринята попытка проведения историко-географической реконструкции русла Днепра в районе г. Шклова с целью подтверждения/опровержения гипотезы о некогда островном положении города. В ходе исследований с использованием полевого, картографического, литературного методов, метода моделирования получен ряд веских аргументов и доказательств в поддержку гипотезы. Промежуточные результаты свидетельствуют: в древности и в средневековье русло р. Днепр проходило вдоль западной террасы. Для установления более точных датировок, корректировки некоторых аргументов (напр., геологических, геоморфологических) планируется продолжение полевых геолого–географических исследований. На основе исследования предполагается разработка методики оптимизации археологических поисков древних городищ, селищ прируслового типа.

*Ключевые слова:* Днепр, Шклов, историко-географическая реконструкция.

In article attempt of carrying out historical and geographical reconstruction of the riverbed of Dnepr around of Shklov for the purpose of a hypothesis confirmation/denial is undertaken about there is no time island position of the city. During researches with use of field, cartographical, literary methods, a method of modeling a number of telling arguments and proofs in support of a hypothesis is received. Intermediate results testify: in the ancient time and the bed of the Dnepr River passed in the Middle Ages along the western terrace. For establishment of more exact datings, correction of some arguments (geological, geomorphological) continuation of field geologo-geographical researches is planned. On the basis of research development of a technique of optimization of archaeological searches of ancient sites of ancient settlement priruslovy type is supposed.

*Keywords:* Dnepr, Shklov, historical and geographical reconstruction.

Адна з унікальных адметнасцяў гісторыі Шклова заключаецца ў тым, што месцазнаходжанне горада змянялася тры разы, і сёння гісторыкі і краязнаўцы маюць справу з першым, другім і трэцім Шкловам [8, с. 30-34, 106]. Аднаго з аўтараў гэтага даследавання (А. Агееў нарадзіўся ў г. Шклове) з юнацтва здзіўляла далёкае ад Дняпра знаходжанне Старога Шклова (гл. дадатак 1). Не з чужых слоў ведаючы памеры ракі Серабранкі, па якой трэба было ў старажытнасці падымацца ад Дняпра да Старога Шклова, нават з улікам яе большай паўнаводнасці ў тыя часы, гэта падавалася дзіўным. Навошта нашым продкам было так далёка ўходзіць ад галоўнай дарогі? Менавіта рэкі ў лясной зоне Еўропы стагоддзямі з'яўляліся транспартнымі артэрыямі, давалі працу і прыбыткі мясцоваму насельніцтву. А па Дняпры ішоў галоўны варыянт шляху «з варяг у грэкі». На ягоных берагах і знаходзіцца большасць прыдняпроўскіх гарадоў.

Само па сабе знаходжанне Старога Шклова ў баку ад Дняпра можна патлумачыць. Усе ведаюць факт пераносу старажытнага Полацка бліжэй да Дзвіны ў ходзе фарміравання моцнага Полацкага княства. Можна прывесці і іншыя прыклады аднosна далёкага знаходжання гарадзішча прырэчышнага тыпу ад асноўных рэк. Па многіх меркаваннях такое размяшчэнне часцяком выклікалася праблемамі бяспекі. Па рэках хадзілі не толькі гандляры, але і разбойнікі, і дружыны князёў, якія часцяком мала адрозніваліся ад першых. Пэўная адлегласць ад ракі – дарогі давала час на падрыхтоўку да абароны. Тым не менш, менавіта задужа далёкая адлегласць у сем – восем кіламетраў уверх супраць плыні ракі, нязручнасць Шклова для начлегу экіпажаў судоў выклікала здзіўленне.

Дапамога ў летнім сезоне 2011 г. археолагам пры правядзенні раскопак у Старым Шклове зноў адрадзіла паўзабытыя пытанні, і ў пэўны момант узнікла гіпотэза, што Стары Шклоў у першыя стагоддзі свайго існавання знаходзіўся не ў сямі – васьмі, а ў двух – трох кіламетрах ад Дняпра. Тады ён магчыма працякаў уздоўж заходняй сваёй тэрасы на захад ад сучаснага г. Шклоў, часткова па сучаснаму рэчышчу р. Серабранка. У гэтым выпадку месцазнаходжанне Старога Шклова становіцца больш лагічным і тыповым, карэлюецца з сітуацыяй ў некаторых іншых гарадах Беларусі ў першыя стагоддзі другога тысячагоддзя. Правядзенне ў апошнія гады інтэнсіўных археалагічных раскопак у Шклове, на наш погляд, робіць праблему яшчэ больш актуальнай.

Дэталёвае знаёмства з геаграфічнымі і гістарычнымі картамі раёна г. Шклова і рэкагнасцыроўка на мясцовасці надало ўпэўненасці ў жыццяздольнасці гэтай гіпотэзы. Сучасны Шклоў амаль на 10 км выцягнуты з поўначы на поўдзень. На мясцовасці на захад ад горада праглядаюцца да гэтага часу рэшткі вялікіх старарэччаў (старыкоў) даўняга Дняпра. Ягонаму шыротнаму развіццю з усходу замінала і замінае рэчышча Дняпра, а з захаду даліна невялікай р. Серабранкі, якая мае непрапарцыянальна вялікую пойму і аддзяляецца ад правай (заходняй) верхняй тэрасы Дняпра.

Кансультацыя супрацоўнікаў Шклоўскага краязнаўчага музея дапамагла пазнаёміцца з адной з версій паходжання назвы Шклоў, якая ўскосна пацвярджала магчымасць у адносна недалёкія часы працякання Дняпра ўздоўж заходняй тэрасы сваёй даліны: «*У старажытнасці па Дняпры плавалі на «шкутах» – своеасаблівых рачных судах. Калі ўзяць першыя літары «шк» – «лоў» (паляванне, лоў), то атрымоўваем цікаўны вынік «шкуталоў». Варта улічыць, што Днепр на поўнач ад Шклова ўтварае нібыта луку: рака рэзка заварочвае на ўсход, а затым – рэзка на поўдзень. Тут яшчэ 80 гадоў таму знаходзіўся востраў. Магчыма гэта месца і было ў свой час «шкуталовам» – тут прыпынялі, лавілі судны, якія плылі ўніз па плыні»* [12]. Выявілася, што ў шклоўскай газеце «Ударны фронт» мясцовыя краязнаўцы таксама выказвалі гіпатэтычнае, на жаль не падмацаванае аргументамі і датоўкамі, згадванне астраўнога становішча тэрыторыі сучаснага Шклова ў старажытнасці [7].

Усе прыведзеныя вышэй аргументы і разважанні падмацоўвалі гіпотэзу. Але заставалася адкрытым пытанне: у якія часы Дняпро абцякаў тэрыторыю сучаснага Шклова з захаду? У мезаліце, неаліце, ці ў XV–XVI стагоддзях? І ці не тым было выклікана перамяшчэнне Шклова ў раён сучаснай в. Рыжкавічы ў XVI стагоддзі, што Дняпро канчаткова змяніў сваё рэчышча і стаў цячы ў сучасным месцы? (гл. дадатак 3). Нявырашанасць гэтых пытанняў падштурхнула да звароту да спецыялістаў – географаў. Сумесна з імі быў арганізаваны ў кастрычніку гэтага года экспедыцыйны выезд у г. Шклоў, апрацаваны атрыманыя матэрыялы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вынікі аналізу атрыманых дадзеных паказалі, што тэатр (грэч. Θέατρον, ад θεάομαι – гляджу, бачу) палявога даследавання – даліна р. Дняпро каля г. Шклоў, якая знаходзіцца ў старажытным тэктанічным разломе і прарэзае ўзгорыста-платападобную з мноствам ярыста-суфазійных форм у месцах пашырэння лёсападобных парод Аршанска-Магілёўскай раўніны (прымеркавана да паўднёвай часткі Аршанскай упадзіны – Магілёўскай мульды). Вышыні на правабярэжжы, якое ў асноўным намі даследуецца, вагаюцца ў інтэрвале ад 152–159 (заходняя ўскраіна г. Шклоў) да 210 м над узроўнем мора (н.у.м.; 70% тэрыторы Шклоўскага раёна знаходзіцца на вышынях 180–200 м) каля в. Стары Шклоў. Урэзы Дняпра 145,4 м (пры ўпадзенні р. Тросенка) на поўнач ад Шклова да 144,0 м на поўдзень ад в. Рыжкавічы.

Рэльеф тэатра даследавання сфарміраваўся, галоўным чынам, пад уплывам сожскага (маскоўскага; рыскага) гляцыяла каля 100–110 тыс. гадоў назад. Ледавік пакінуў пасля сябе Ашмянскую паласу краявых марэнных утварэнняў. На Шклоўскі раён прыходзіцца ўсходняя частка паласы, якая вельмі добра праглядаецца ў араграфіі і прадстаўлена пагорыста-марэным рельефам. Уплыў на рэльеф аказалі і талыя воды паазерскага (валдайскага; вюрм) ледавіка. Складаныя сістэмы сожскага ледавіка назіраюцца як у даліне р. Марьянка, так і на правабярэжжы Дняпра, на захад ад г. Шклоў – у міжрэччы рр. Тросенка і Серабранка. Значная па даўжыні паласа марэнных утварэнняў цягнулася на захад ад Дняпра, была «перапілена» рр. Друць і Вабіч. Менавіта да захаду раёна прымеркаваны вышыні 222 (каля в. Каменка), 223 м н.у.м. (каля в. Палыкавічы).

Можна меркаваць, што рр. Тросенка (11 км), Серабранка (17 км, выцякае з воз. Чарнянскае) сваімі прытокамі праз старажытныя азёры (потым балоты; напрыклад, паклады Троснаўскага радовішча суглінкаў і глін звязаны з азёрна-балотнымі адкладамі паазерскага ледавіка) былі злучаны (у тым ліку старажытнымі каналамі) і ўтваралі «востраў» – марэнны пагорак (пл. каля 37 км²), на якім у розны час узніклі сённяшнія вв. Вялікі Стары Шклоў, Карзуны, Вялікая і Малая Лотва (вёска з такой назвай ёсць і ў Каменналаўскім с/с), Зямцы, Зароўцы, Бяланава, Дуброва, Брус, Краснае, Тросенка і інш. На гэтым «востраве» і быў утвораны першапачатковы Шклоў (сёння – в. Вялікі Стары Шклоў) (гл. дадатак 2).

На поўначы вялікашклоўскага «вострава» цячэ каналізаваная р. Тросенка (канал). Назва яе, хутчэй за ўсё, не прывязана да назвы расліны. У розны час яна магла насіць назвы Лотва/Латва, Трасна-Драсна (дала назву вв. Малая і Вялікая Лотва). «Лута /лота» ад фіна-вугорскіх асноў «ludo, luoto» ў значэнні «астравок», «камяністая водмель»; «лода» – «мелкае камяністае месца на рацэ» [14], акрамя гэтага, «латва» (фін.) – «вяршына, вярхушка, макушка» (лот/лат=лад), а «latava» – «гліністая рака» [11]. Паміж вытокамі рр. Тросенка і Серабранка знаходзіцца в. Лутна. Р. Аўчыннікава лічыць корні «дра», «др» «азёрнымі» [1, с. 33-35]. Але ў Еўропе, на Беларусі дастаткова шырока распаўсюджаны кельцкі корань «др» (Друць, Драва, Одра, Адроў), што вынікае з сувязі з кельцкім «pheder» – балота. У той жа час старажытнаславянкае «одр» – ложа, рэчышча («одр» – абмежаванне рачнога струмення), а такжа «др» – дрэва (як і «тры», Трылесіна), бо рачная сістэма падобная на крону дрэва; «одр» – у значэнні «цячэнне», «выток» [4, с. 265]. Акрамя гэтага, аснова «др», «дра» магла выкарыстоўвацца ў сэнсе «мяжа», «водная мяжа, рубеж» (напрыклад, мяжа воласці старажытнага Шклова). «Др» – яшчэ і корань індаіранскага паходжання ад «удор» – вада. З поўдня «востраў» абмяжоўваўся р. Серабранка-Шклавянка-Шклява (падобны гідронім Клева-Клява). Адна з назваў Серабранкі – Язон, Язоны (Яжона, Езона [16, с. 130]), што можа азначаць, на думку В. Жучкевіча «старарэчча, мелкаводная затока», І. Сразнеўскага, Э. Мурзаева – «перакат на рацэ, свайны надалб» [4, с. 116]. Такім чынам, многія тапонімы сведчаць, што на ўсходзе ад першапачатковага Шклова павінен быў быць нейкі вялікі вадацёк. Такім вадацёкам, на наш погляд, магло з'яўлялася Старэчча – правы рукаў р. Дняпро. У рукаў няслі свае воды і Тросенка, і Серабранка.

Вялікашклоўскі геалагічны «востраў» – марэнны пагорак быў забяспечаны неабходнымі рэсурсамі: карысныя выкапні (торф – на захадзе і ўсходзе), суглінкі і гліны (сучаснае Троснаўскае радовішча), будаўнічыя пяскі (сучаснае Шклоўскае радовішча) і камень, угоддзі для «лова» (палявання, рыбнай лоўлі, з(пад) біральніцтва) – лясы падзоны дубава-цёмнахвойных лясоў з хвоі, елкі, дуба і інш. (дзік, казуля, лось, заяц-русак, заяц-бяляк, вавёрка, куніца, лісіца, ласка і інш.), рэкі (а на 13 меандрах [9] – ур. Завароты – на р. Серабранка, магчыма, рыбагадоўля, гл. дадатак 4), азёры, леса-балотныя, сельскагаспадарчыя угоддзі на «пасеках», «чарцях» на дзярнова-падзолістых, дзярнова-падзолістых забалочанных на лёсападобных суглінках, якія падсцілаюцца марэнай, месцамі пяскамі, на поймавых глебах. Па меркаванню некаторых мясцовых краязнаўцаў, рачныя судны маглі падымацца да вярхоўяў Серабранкі (і, магчыма, Тросенкі).

Пасля пэўных гістарычных падзей, першапачатковы Шклоў («Шклоў-1», в. Стары Вялікі Шклоў) «пераехаў» на новае месца – сённяшняя в. Рыжкавічы – так званы «Шклоў-2», а затым лакалізаваўся на сучасным месцы. І «Шклоў-1», і «Шклоў-2» у свой час мелі астраўное палажэнне. Тэрыторыя сённяшняга Шклова («Шклоў-3»), па нашай гіпотэзе, таксама знаходзілася на востраве.

Аргументы і доказы на карысць гіпотэзы:

1. Вялікі Стары Шклоў па прамой лініі знаходзіцца за чатыры кіламетры ад сучаснага рэчышча Дняпра, а па рацэ прыкладна ў сямі – васьмі ад вусця р. Серабранка (дастаткова далёка ад рэчышча для ўзнікнення буйнога гандлёвага пасялення прырэчышнага тыпу). Калі існавала Старарэчча – адлегласць складзе каля двух кіламетраў.

2. Картаграфічны метад (вывучэнне дынамікі) – аналіз плана Генеральнага межавання (XVII от.), 3-вёрстнай карты Шуберта (здымкі другой паловы XIX ст., друк другой паловы XIX ст. – пачатку 1900-х гг.), карт РСЧА 1920-х, 1930-х гг., сучаснага плана інжынерна-геалагічнага раянавання (М 1: 10000) – даюць падставу для такога сцвярджэння (гл. дадаткі 5-7).

3. Лакалізацыя вусцевых частак яроў на захадзе ад сучаснага г. Шклоў даказвае, што базісам эрозіі з'яўлялася менавіта гіпатэтычнае Старарэчча – правы рукаў Дняпра (гл. дадаткі 8-12).

4. Тапанімічны аналіз. М. Пятроўскі [12] нагадвае, што ў ПВЛ згадваецца пасяленне Заруб на месцы в. Стары Шклоў. Аўтар тлумачыць гэту назву адназначна – ад архаічнага земляробства. Але, аснова «руб», па сэнсу блізкая да «пропань», «рваць», «драць» – магчыма, тут справа ў тым, што Дняпро «прарваў/прадраў» новае рэчышча, што і тлумачыцца яго рэзкімі заваротамі. Вёска Зароўцы (як і летапісны г. Зароў на ўсходзе вобласці) размешчана за «ровам» – або яр, які выходзіць у даліну гіпатэтычнага Старарэчча, або «прорва» – само Старарэчча. На левым беразе р. Серабранка і каля былога Старарэчча знаходзіцца в. Дзяжкі. Яе назва – ад асновы «дзяга», якую В. Жучкевич тлумачыць як «перавязь, рэмень» [4, с. 115], што, верагодна, звязана з вытворчасцю перавязей, снасцей для рачных суднаў-шкутоў (магчыма, і бурлакоў), якія праходзілі па Старарэччу. Магчыма, што ўсё Старарэчча насіла назву Язоны, якая потым перайшла на ніжнюю плыню р. Серабранка, на саму р. Серабранку. Ад сённяшняга размяшчэння, назву горада Шклоў растлумачыць цяжка. Але, калі прыняць нашу гіпотэзу, то сітуацыя больш-менш праясняецца: Шклоў – у значэнні «рака, ручай; бліжняя, родная рака» (тапанімічная экстрапаляцыя па: [5]) або «рака, даліна» [10; 15]. Справа ў тым, што калі браць дапушчэнне аб фіна-вугорскай версіі, то атрымаем: «ікеле / ікель / кель / -кль – «пярэдні, бліжні» [5]; «-ель» – само па сабе – «ручай». У назве Шклоў праглядаюцца некалькі фіна-вугорскіх асноў: «шош» (як и р. Сож – «рака», «ручай»), «кель/кл» («ляй» – «вада»), «ва» – «вада». Назва в. Хоцімка (на бер. р. Серабранка) падмацоўвае фіна-вугорскую версію назвы Шклоў. У адпаведнасці з поглядамі І. Папова, шматлікія падобныя назвы – фіна-вугорскія, гідранімічныя [13, с. 125]. М. Пятроўскі тлумачыць назву Шклоў ад асноў «скора/скура/шкура», «лоў» (паляванне) [12].

5. На захад ад сучаснага г. Шклоў знаходзіцца радовішча торфу (распрацоўвалася торфазаводам у 1932–1982 гг.), які забяспечваў палівам фабрыку «Спартак». Невялікае па магутнасці тарфяных пластоў радовішча прымеркавана да даліны Старарэчча. Яно звязана як з натуральнымі працэсамі торфаназапашвання (сярэдняя хуткасць назапашання торфу ў нармальным рэжыме – 1 м за 500 год), так і антрапагенным уздзеяннем. Магчыма, сістэма гідратэхнічных збудаванняў – старажытных дамб, прудоў, каналаў, шлюзаў-«млыноў» (якія ўзгадвае Зорыч [2]), якая магла існаваць у дыяпазоне прыкладна 1500–300 год назад, прывяла да паскарэння працэсаў адкладання торфа.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сістэма, хутчэй за ўсё, магла пачаць прыходзіць ў заняпад пад час ваенных катаклізмаў XVI-XVII стст. Ад яе засталася толькі дамба на р. Серабранка каля в. Рыжкавічы (пост міліцыі).

6. Дадзеныя схем, архітэктурна-планіровачных мерапрыемстваў (Сіваеў Г. М., галоўны архітэктар г. Шклова), экалагічных службаў (Цітоў А. У., раённая экалагічная інспекцыя), геалагічнага прадпрыемства «Геасервіс» не абвяргаюць, а ўскосна (пакуль ускосна – без дадзенных свідравання) пацвярджаюць гіпотэзу.

7. Наяўнасць рачных наносаў (адкладаў, алювію) падцвярджаюць жыццяздольнасць меркавання (гл. дадатак 13).

8. Знаходка ў 1963 г. «шклоўскага ідала» (пясчанік, X ст.) у Кукушкіным рве [6, с. 24]. (калі прыняць асноўную версію каля чыг. Орша–Магілёў, на поўнач ад Брынкава Рва, на захад ад аўтавакзала (роў часта блытаюць з Ганчарным рвом каля в. Хоцімка). Ідал мог быць у свой час скінуты з паганскага капішча ў раку – Старарэчча). Сведчанні мясцовых жыхароў – пачутая краязнаўцамі інфармацыя 1950-х – 1961 гг. аб знаходцы чоўна/ладзі (???) насупраць Кукушкіна рва таксама «працуюць» на карысць гіпотэзы.

9. Некаторыя літаратурныя сведчанні: М. Пятроўскі ўзгадвае цікавы факт – да 1880-х гг. існаваў востраў, на поўначы якого з дапамогай «шкуталова» лавілі шкуты (назва мясцовых суднаў), якія разганяліся па цячэнні, каб тыя не разбіліся, не перакуліліся [12].

Такім чынам, можна дастаткова ўпэўнена казаць, што ў старажытнасці рэчышча р. Дняпро праходзіла ўздоўж заходняй тэрасы. У дыяпазоне 1500–500 гадоў назад рака вышэй Шклова ўтварыла новае рэчышча: павярнула на ўсход, а затым на поўдзень. Верагодна, нейкі час адначасова існавалі адразу два рэчышчы і тэрыторыя сучаснага Шклова знаходзілася на востраве. Можна меркаваць, што Старарэчча пазней пэўны час існавала ў форме канала, паступова дэградавала, забалоцілася. У ім пачаліся інтэнсіўныя працэсы торфаназапашвання. Па ягонай ніжняй частцы пачала цячы р. Серабранка.

У гісторыі Шклова распрацоўваемая гіпотэза можа патлумачыць выбар для пасялення ў канцы першага тысячагоддзя нашай эры ўзгоркаў менавіта ў раёне в. Стары Шклоў, які тады знаходзіўся ў двух – двух з паловай кіламетрах ад тагачаснага Дняпра. Такое месцазнаходжанне цалкам кладзецца ў прынцыпы ўтварэння гарадзішчаў прырэчышнага тыпу той эпохі. Паступовая дэградацыя Старарэчча прывяла да таго, што Стары Шклоў аддаліўся ад Дняпра на адлегласць прыкладна ў сем – восем кіламетраў па плыні р. Серабранка. Гэты геаграфічны чыннік мог стаць не проста адным з фактараў [3], а адной з галоўных прычын пераносу горада Шклова (Шклоў-1) на новае месца ў раён сучаснай в. Рыжкавічы (Шклоў-2) ў XVI ст.

Каб вызначыць больш дакладны час утварэння новага рэчышча Дняпра мы плануем ў наступным сезоне правесці дадатковыя геолага-геаграфічныя даследаванні, на падставе якіх мяркуецца выпрацоўка методыкі аптымізацыі іх правядзення для аблягчэння археалагічных пошукаў старажытных гарадзішч і селішч прырэчышнага тыпу.

**Літаратура:**


1. Аўчыннікава, Р. І. Тапанімія сярэдняга цячэння р. Заходняя Дзвіна / Р. І. Аўчыннікава // Чэрскі Іван Дзяменцьевіч. Да 160-годдзя з дня нараджэння. Зб. артыкулаў. Вып. 1. – Мінск : БДУ, 2005. – С. 33-35.
2. Дело о Шкловском доминиканском монастыре. РГИА. – Ф. 1526 – Оп. 1 – Д. 396 – Л. 7.
3. Дзярновіч, А. Шклоў. Да пытання ўзнаўлення горада / А. Дзярновіч // Паведамленні 2-й абласной краязн. канф. 29 кастрычніка 1991 г. – Магілёў, 1992. – С. 50-52.
4. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд. БГУ, 1974.
5. Инжеватов, И. К. Топонимический словарь Мордовской АССР. 2-е изд. / И. К. Инжеватов. – Саранск, 1987.
6. Копытин, В. Ф. Археологические памятники Шкловского района Могилевской области / В. Ф. Копытин. – Могилев, 1993.
7. Кучеренко, Михаил. Сколько лет Шклову? / Михаил Кучеренко // Ударны фронт. – 2003 г., 19 лістапада. – С. 2-3.
8. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие / О. Н. Левко. – Минск: Бел. Навука, 2004.
9. Лярский, П. А. Пять туристических маршрутов по Могилевской области / П. А. Лярский, Н. С. Ратобыльский. – Могилев, 1957.
10. Манаков, А. Г. Этногенез славян по данным топонимии (историко-географическое исследование) / А. Г. Манаков. – Псков : ЛОГОС, 2007. – 256 с.
11. Мурзаев, Э. М. Очерки топонимики / Э. М. Мурзаев. – Москва : Мысль, 1974.
12. Петровский, М. Почему – Шклов? / М. Петровский // Неман. – 1968. – № 8. – С. 189 – 190.
13. Попов, И. А. Географические названия: Введение в топонимику / И. А. Попов. – М.-Л.: Наука, 1965.
14. Пракаповіч, І. Адкуль паходзяць назвы: Назвы рэк і азёр Пастаўскага раёна. / І. Пракаповіч. – Наваполацк, 2000.
15. Смолицкая, Г. П. Топонимический словарь Центральной России: Географические названия / Г. П. Смолицкая. – Москва : Армада-пресс, 2002. – 416 с.
16. Шаруха, І. М. Геаграфічна-статыстычны слоўнік Магілёўскай вобласці. Частка XXI. Шклоўскі раён / І. М. Шаруха // Магілёўскі мерыдыян. – Т. 7. – Вып. 3-4. (2007. – № 3-4 (№ 10-11). – С. 107-130.


## Дадаткі

**Дадатак 1** – Стары Шклоў – Шклоў – Рыжкавічы (карта Шуберта, XIX ст.)






Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**Дадатак 2** – Даліна р.Серабранка ў в. Стары Вялікі Шклоў (даліна ў гэтым месцы мае амаль правільны прамавугольны контур)



**Дадатак 3 –** в. Рыжкавічы - Шклоў-2 (гарызанталі карты па заходняй мяжы падцвярджаюць магчымасць таго, што на захадзе сённяшняй вёскі працякаў вадаток, напрыклад, ніжняя плыня р. Серабранка. Сучаснае вусце р. Серабранкі знаходзіцца на поўнач ад Аршанскага прадмесця)




**Дадатак 4 –** Сучасная сістэма запрудаў для рыбагадоўлі на адным з меандраў р.Серабранкі. Такія гідратэхнічныя збудаванні маглі існаваць і ў старажытнасці для праходу рачных суднаў уверх па плыне да цэнтру колішняга Шклова (Шклоў-1).





Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадатак 5** – Фрагмент 3-вёрстнай карты Шуберта, XIX ст. (маштаб не вытраманы).
Вектарамі паказаны магчымыя накірункі гіпатэтычнага рэчышча Старарэчча.




**Дадаткі 6, 7** – Шклоў на картах 1920–30-х гг.




Шклоў і наваколлі на фрагменце карты 1923-1925 гг. N-36-61-А. М 1:50000 (маштаб не вытрыманы). Карта складзена перад пачаткам тарфяных распрацовак. Выдатна праглядаецца гіпатэтычны востраў і мяркуемае Старарэчча на захад ад сучаснага г. Шклоў.




Шклоў і наваколлі на фрагменце карты 1936-1937 гг. N-36-61. М 1:100000 (маштаб не вытрыманы). Час першага перыяду тарфяных распрацовак (1932-1941). Добра праглядаецца гіпатэтычны востраў і мяркуемае Старарэчча на захад ад сучаснага г. Шклоў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадатак 8 –** Выгляд з захаду на сучасны Шклоў.
Насыпы шашы і чыгункі вельмі істотна змянілі даліну р. Серабранкі – Старарэчча (аўтамабільны мост праз яе на пярэднім плане).



**Дадатак 9** – Даліна сярэдняй плыні р. Серабранкі – гіпатэтычнае Старарэчча



**Дадатак 10** - Фрагмент сучаснай «Схемы інжынерна-геалагічнага раянавання. Шклоў.
Маштаб 1:10000» (маштаб не вытрыманы). Згодна з легендай да схемы, на месцы мяркуемага Старарэчча блізка да паверхні падыходзяць грунтовыя воды, глебавае покрыва да 0,3 м, пад ім - пяскі розных фракцый (2-11 м), глыбей – марэна (магутнасцю больш за 15 м). У западзінах – торф (0,5-0,7 м). На схеме бачна лакалізацыя вусцевых частак яроў





Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дадаткі 11-12** – Шклоў і наваколлі на сучасных картах



Асушальныя каналы акантурваюць гіпатэтычны востраў




Контуры гіпатэтычнага вострава

**Дадатак 13** – Чацвярцічныя адклады Шклоўскага раёна
aIV – алювіяльныя; gIIsz – марэныя, дняпроўска-сожскія водна-ледавіковыя, сярэдне-верхнепаазерскія алювіяльныя тэрасавыя, флювіягляцыяльныя надмарэнныя сожскага падгарызонта




**Дадатак 14** – «Востраў» на фрагменце геалагічнай карты 1980-х гг.




Условные обозначения

- Населенные пункты
- Города
- Малые водотоки
- Реки

Четвертичные отложения

- Аллювиальные отложения пойм. Пески, супеси, галька, гравий
- Аллювиальные отложения первых надпойменных террас в долинах рек к югу от границы валдайского оледенения
- Аллювиальные отложения вторых надпойменных террас в долинах рек к югу от границы валдайского оледенения
- Болотные отложения. Торф
- Моренные отложения московского оледенения. Супеси и суглинки валунные, пески, гравий, галька
- Флювиогляциальные отложения времени отступания московского ледника. Пески, гравий, галька

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова